УДК 378.147:[069:351.853]

***І. Г. Лупашка,***
*кандыдат культуралогіі, дацэнт,*
*дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», г. Мінск, Беларусь*

# ВЫКАРЫСТАННЕ ТВОРЧЫХ ЗАДАННЯЎ У ПРАЦЭСЕ НАВУЧАННЯ ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ ПРАФЕСІЙНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ (на прыкладзе спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны»)

**Анатацыя.** Адной з асноўных задач сістэмы вышэйшай адукацыі з’яўляецца фарміраванне ў студэнтаў прафесійных кампетэнцый, якія адпавядаюць запатрабаванням працадаўцаў. Поруч з традыцыйнымі формамі навучання сваю эфектыўнасць дэманструюць і інавацыйныя. У артыкуле прааналізаваны асабісты вопыт выкарыстання творчых заданняў у працэсе выкладання спецыяльных дысцыплін для студэнтаў спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». Творчыя заданні разглядаюцца як адзін са сродкаў развіцця крэатыўнасці, стрэсаўстойлівасці, самастойнасці і фарміравання базавых прафесійных кампетэнцый.

**Ключавыя словы:** прафесійныя кампетэнцыі, творчыя заданні, музей, музейная справа, гісторыка-культурная спадчына, вышэйшая адукацыя.

***I. Lupashko,***
*PhD in Culturology, Associate Professor, Associate Professor of Historical and Cultural Heritage Department of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

# USE OF CREATIVE TASKS IN THE LEARNING PROCESS AS A MEAN OF FORMATION OF PROFESSIONAL COMPETENCIES (on the example of specialty "museum management and protection of historical and cultural heritage")

**Abstract.** One of the main tasks of the higher education system is the formation of students' professional competencies that meet the needs of employers. Along with traditional forms of education, innovative ones demonstrate their effectiveness. In the presented article the author analyzes her personal experience of using creative assignments in the process of teaching special disciplines for students of the specialty "museum management and protection of historical and cultural heritage". Creative

assignments are considered as one of the means of developing creativity, stress resistance, independence and formation of basic professional competencies.

**Keywords:** professional competencies, creative tasks, museum, museum management, historical and cultural heritage, higher education.

Падрыхтоўка спецыяліста з вышэйшай адукацыяй мяркуе авалоданне ім шэрагам кампетэнцый. У дадзеным артыкуле мы абапіраліся на азначэнні кампетэнцый (універсальныя, базавыя прафесійныя і спецыялізаваныя), якія прымяняюцца ў адукацыйным стандарце вышэйшай адукацыі па разглядаемай спецыяльнасці 6-05-0322-03 – Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны [1]. Неабходны для нашага даследавання тэрмін «базавыя прафесійныя кампетэнцыі» вызначаецца адукацыйным стандартам як кампетэнцыі, якія фарміруюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да выпускніка, які засвоіў адукацыйную праграму бакалаўрыята, і якія адлюстроўваюць яго здольнасць вырашаць агульныя задачы прафесійнай дзейнасці ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю [1].

Фарміраванне неабходных кампетэнцый магчыма разнастайнымі сродкамі, у тым ліку ў працэсе выканання творчых заданняў. Пытанні выкарыстання творчых заданняў у працэсе навучання разглядаліся многімі даследчыкамі (Л. А. Фядотава, С. П. Зубава, К. А. Гараева, А. В. Хутарскі і інш.), якія закранулі разнастайныя аспекты гэтай дзейнасці (асаблівасці індывідуальных і калектыўных творчых заданняў, творчыя заданні як сродак развіцця самастойнай дзейнасці і паскарэння адаптацыі першакурснікаў, як форма актывізацыі пазнавальнай дзейнасці і інш.) [2; 3; 5; 6].

Беларуская педагагічная энцыклапедыя не дае дэфініцыю паняцця «творчыя заданні», аднак вызначае творчую дзейнасць як «практычную ці тэарэтычную работу, дзякуючы якой ствараецца нешта якасна новае, непаўторнае, арыгінальнае (новая мэта ці прадукт, вынік ці новыя сродкі, новыя спосабы іх дасягнення, якія маюць грамадскае значэнне); у шырокім сэнсе – стварэнне культурных каштоўнасцей і іх інтэрпрэтацыя» [4]. Такім чынам, пад творчым заданнем мы разумеем заданне, якое накіравана на арганізацыю творчай дзейнасці.

У прадстаўленым артыкуле аўтарам прааналізаваны асабісты вопыт выкарыстання творчых заданняў у працэсе выкладання

спецыяльных дысцыплін для студэнтаў спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны».

Першая спецыяльная вучэбная дысцыпліна, якая выкладаецца студэнтам ужо ў першым семестры – «Уводзіны ў спецыяльнасць». Адзначым, што ў гэты перыяд ідзе актыўная адаптацыя першакурснікаў да новай арганізацыйнай формы навучальнага працэсу і да студэнцкага калектыву. Таму студэнтам прапануюцца два віды творчых заданняў: калектыўныя (у малых групах), якія спрыяюць, у тым ліку і адаптацыі, і індывідуальныя, дзе спалучаюцца задачы развіцця самастойнай і пазнавальнай дзейнасці.

Творчыя заданні студэнты атрымліваюць пры вывучэнні тэмы «Накірункі дзейнасці сучасных музеяў», а менавіта пры разглядзе асноў навуковага камплектавання музейных фондаў. Уводзяцца паняцці: прадмет музейнага значэння (далей – ПМЗ), музейны прадмет (далей – МП), атрыбуцыя, сістэматызацыя, класіфікацыя і інтэрпрэтацыя МП.

Творчае заданне «Схаваныя сэнсы простых рэчаў» выконваецца ў малых групах (3–4 чал.). Студэнты выбіраюць умоўны ПМЗ, які ўсім вядомы і, на першы погляд, не мае іншых сэнсаў: паштоўка, паштовая марка, школьны падручнік, банкнота, манета і г. д. Заданне – знайсці і прадставіць аўдыторыі «схаваныя сэнсы» прадметаў, а менавіта агульныя атрыбуцыйныя характарыстыкі (інфарматыўнасць, рэпрэзентатыўнасць, атрактыўнасць, асацыятыўнасць) і магчымасці іх інтэрпрэтацыі ў музейнай дзейнасці.

Як прыклад, разгледзім у якасці аб’екта даследавання «звычайную» паштоўку. Відавыя паштоўкі могуць змяшчаць выявы знакамітых мясцін таго ці іншага краю, архітэктурныя будынкі (як захаваўшыяся, так і ўжо страчаныя). Такія паштоўкі раней часта з’яўляліся своеасаблівым прывітаннем з турыстычных мясцін. Паштоўкі-рэпрадукцыі звычайна змяшчаюць кароткую інфармацыю не толькі аб аўтары, але і аб музеі, у фондах якога захоўваецца твор мастацтва. Наборы такіх паштовак з’яўляліся своеасаблівымі «музейнымі каталогамі» для шырокай публікі. Віншавальныя паштоўкі могуць з’яўляцца крыніцай інфармацыі аб дзяржаўных святах таго ці іншага перыяду, а іх дызайн сведчыць аб мастацкіх густах эпохі. Аналіз эпісталярнага тэксту дае ўяўленні аб сацыяльна-бытавых адносінах, прыня-

тых формах камунікацыі і інш. А эпісталярыі знакамітых асоб з'яўляюцца жаданым прадметам у фондах любога музея. У бягучым навучальным годзе для выканання творчага задання асобнымі студэнтамі былі абраны для аналізу і даволі рэдкія прадметы, напрыклад гульня «Манаполія» і відэагульні на дысках.

Наступнае творчае заданне ў межах таго ж курса з'яўляецца індывідуальным і мае назву «Збіраем сямейную калекцыю». Пасля тэарэтычнага вывучэння матэрыялу, у выніку чаго студэнты атрымліваюць інфармацыю аб сутнасным вызначэнні музейнай калекцыі і асноўных прынцыпах яе фарміравання, было прапанавана прадставіць групе сямейную рэліквію (ці прадмет, які можа стаць ёй у будучым), якая зойме пачэснае месца ў сямейнай калекцыі. Сярод абраных прадметаў: пішучая машынка; ваенныя ўзнагароды прадзеда; радыёпрыёмнік 1957 г. выпуску; значок «Ударник труда»; узнагароды за вучэбныя дасягненні ўсіх членаў сям'і (пахвальны ліст дзядулі, чырвоны дыплом бабулі, залаты медаль маці, узнагароды за творчыя дасягненні студэнта); акцябрацкая зорачка і піянерскі гальштук; біблія 1900 г. ад бабулі; чайны сервіз 1960–70-х гг.; сервіз «Мона Ліза»; навагодняя елка; крыжык і пярсцёнак, падараваныя бабуляй на дзень нараджэння; фотаальбом з вясельнымі здымкамі бацькоў; асабісты альбом з дзіцячымі малюнкамі.

Так, у выніку самастойнай творчай дзейнасці студэнты замацоўваюць прынцыпы адбору ПМЗ, фарміравання калекцый, першаснага навуковага апісання МП. Такім чынам, нягледзячы на ўводны характар курса, закладаюцца асновы фарміравання базавых прафесійных кампетэнцый.

Калі вышэйапісаныя заданні можна аднесці да даследчага тыпу, то ў наступным творчым заданні больш выражаны крэатыўны кампанент, які спалучаецца з кагнітыўным.

Заданне з умоўнай назвай «Музей, якога не існуе» студэнты выконваюць на 3 курсе ў межах вучэбнай дысцыпліны «Музеі Беларусі». Вызначальнай мэтай выкладання гэтай дысцыпліны з'яўляецца вывучэнне студэнтамі сучаснага стану музейнай сеткі Рэспублікі Беларусь, асноўных кірункаў дзейнасці беларускіх музеяў і іх перспектыў. За вучэбны семестр студэнты павінны распрацаваць, а напрыканцы прадставіць аўтарскую

канцэпцыю музея. Ва ўмовах задання мяркуецца, што «аўтары канцэпцыі» маюць неабмежаваныя магчымасці як матэрыяльныя, так і ў фарміраванні калекцый патэнцыяльнага музея.

Аналіз канцэпцый музеяў за апошнія некалькі гадоў паказвае, што прадстаўлены канцэпцыі як фантазійных ці цяжка рэалізуемых праектаў (наогул ці ў Беларусі), так і тыя, што пры пэўных умовах могуць быць увасоблены.

Сярод першых – Музей імя самога сябе, Музей студэнцкага інтэрната, Музей утульнасці і камфорту, Музей нараджэння Сусвету, Музей Атлантыды, Музей «аб музеях», Музей снобачанняў і інш. Не маюць прывязкі да Беларусі і такія канцэпцыі, як Музей сіткомаў, Музей астранамічных і навігацыйных прыбораў, Музей жырандоляў, Музей вуціных, Музей мадэлізму, Музей камп'ютарных гульняў, Музей касметыкі.

Значная частка канцэпцый, распрацаваных студэнтамі, на наш погляд, маюць добры патэнцыял для іх рэалізацыі. Радуе, што сярод іх шмат ідэй, скіраваных на захаванне беларускай культурнай спадчыны: Музей беларускай цацкі, Музей беларускіх народных казак, Музей беларускай мовы, Музей бульбы і Музей дранікаў, Музей шахмат усходніх славян, Музей беларускіх міфічных істот, Музей беларускай музыкі (і асобны праект – Музей беларускага рока і сучаснай музыкі).

Асобнай групай вылучаюцца канцэпцыі, прысвечаныя ваеннай гісторыі: Музей-бункер І Сусветнай вайны, гісторыка-культурны комплекс «Бабруйская крэпасць», Музей Аршанскай бітвы, Музей вайсковай славы ВКЛ і інш.

Некалькі канцэпцый уздымаюць тэму полікультурнасці і талерантнасці беларускага народа: Музей беларускіх цыган, Музей дыяспар (у Беларусі) і Музей беларускай дыяспары (за мяжой).

Выкананне гэтага творчага задання замацоўвае тэарэтычныя веды ў такіх кірунках, як навукова-фондавая (адбор МПЗ і камплектаванне музейных фондаў), экспазіцыйна-выставачная (асновы навуковага і мастацкага праектавання экспазіцый), культурна-адукацыйная (узаемадзеянне з музейнай аўдыторыяй) дзейнасць музеяў. Пры распрацоўцы канцэпцыі музея неабходна выкарыстанне дадатковых крыніц інфармацыі, што спрыяе актывізацыі самастойнай пазнавальнай дзейнасці студэнтаў.

Такім чынам, творчыя заданні, выкарыстоўваемыя ў рамках выкладання спецыяльных дысцыплін, развіваюць у студэнтаў

такія якасці, як крэатыўнасць, стрэсаўстойлівасць, самастойнасць і інш. і спрыяюць фарміраванню прафесійных кампетэнцый.

1. Аб зацвярджэнні адукацыйнага стандарту агульнай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0322-03 [Электронный ресурс]: пастанова Міністэрства адукацыі Рэсп. Беларусь, 23.08.2023, № 274 // Нац. правовой интернет-портал Респ. Беларусь. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22340475p. – Дата доступа: 01.12.2023.

2. *Гараева, Е. А.* Опыт использования индивидуальных творческих заданий в образовательном процессе университета / Е. А. Гараева // Современные проблемы науки и образования. – 2022. – № 4. – С. 56.

3. *Зубова, С. П.* Творческие задания как способ вовлечения студентов в активную творческую квазипрофессиональную деятельность / С. П. Зубова, Л. В. Лысогорова // Поволжский пед. вестн. – 2020. – Т. 8, № 3(28). – С. 92–95.

4. *Котикова, О. П.* Творческая деятельность / О. П. Котикова // Белорус. пед. энцикл. : в 2 т. / редкол. : Н. П. Баранова [и др.]. – Минск, 2015. – Т. 2. – С. 379.

5. *Федотова, Л. А.* Ускорить адаптацию первокурсников: коллективные творческие задания / Л. А. Федотова // Тенденции развития науки и образования. – 2019. – № 50 (8). – С. 11–13.

6. *Хуторской, А. В.* Дидактическая эвристика: теория и технология креативного обучения / А. В. Хуторской. – М. : Изд-во МГУ, 2003. – 416 с.

УДК 316.4+316.7/.736(4)(510)

***Лу Ся,***
*соискатель ученой степени кандидата наук*
*учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», г. Минск, Беларусь*

## ИНТЕРПРЕТАЦИЯ ПОНЯТИЯ «ИНКЛЮЗИВНОСТЬ КУЛЬТУРЫ» В ЕВРОПЕЙСКОМ И КИТАЙСКОМ ГУМАНИТАРНОМ ДИСКУРСАХ

**Аннотация.** Рассматриваются теоретико-методологические подходы китайских и европейских исследователей к трактовке категории «инклюзия» и производной от нее дефиниции «инклюзивность культуры». Отмечается, что, несмотря на широкое использование данной категории в современном гуманитарном дискурсе, ее сущность и содержание интерпретируются неоднозначно. Значительное число обществоведов относят данную категорию к сфере культуры. Часть